26 студзеня 2025

ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь
# Кандидаты в Президенты Республики Беларусь



**ГАЙДУКЕВІЧ**
**Алег Сяргеевіч**

**ГАЙДУКЕВИЧ**
**Олег Сергеевич**

Нарадзіўся 26 сакавіка 1977 года ў горадзе Мінску.

Закончыў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Правазнаўства» і Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны».

З 1999 па 2012 гады працаваў на розных пасадах у праваахоўных органах Рэспублікі Беларусь.

Быў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання.

Уваходзіць у склад камісіі Парламенцкага Сходу Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі па міжнародных справах, міграцыйнай палітыцы і сувязях з суайчыннікамі.

Старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі.

Мае дзвюх дачок. Валодае замежнымі мовамі.

Родился 26 марта 1977 года в городе Минске.

Окончил Академию Министерства внутренних дел Республики Беларусь по специальности «Правоведение» и Институт государственной службы Академии управления при Президенте Республики Беларусь по специальности «Международные отношения».

С 1999 по 2012 годы работал на различных должностях в правоохранительных органах Республики Беларусь.

Был депутатом Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь седьмого созыва.

Заместитель председателя Постоянной комиссии по международным делам Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь восьмого созыва.

Входит в состав Комиссии Парламентского Собрания Союзного государства России и Беларуси по международным делам, миграционной политике и связям с соотечественниками.

Председатель Либерально-демократической партии Беларуси.

Имеет двух дочерей. Владеет иностранными языками.



**КАНАПАЦКАЯ**
**Ганна Анатольеўна**

**КАНОПАЦКАЯ**
**Анна Анатольевна**

Нарадзілася 29 кастрычніка 1976 года ў горадзе Мінску.

Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Правазнаўства», Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне нацыянальнай эканомікай».

Палітык, юрыст. Кіраўнік прававой установы «Грамадскі цэнтр заканадаўчых ініцыятыў». Індывідуальны прадпрымальнік, які аказвае юрыдычныя паслугі.

Была дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

У 2020 годзе ўдзельнічала ў выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у якасці кандыдата.

Жыве ў горадзе Мінску. Беспартыйная. Мае сына і дачку. Валодае англійскай і нямецкай мовамі. Займаецца дабрачыннасцю.

Родилась 29 октября 1976 года в городе Минске.

Окончила Белорусский государственный университет по специальности «Правоведение», Академию управления при Президенте Республики Беларусь по специальности «Государственное управление национальной экономикой».

Политик, юрист. Руководитель правового учреждения «Общественный центр законодательных инициатив». Индивидуальный предприниматель, оказывающий юридические услуги.

Была депутатом Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь шестого созыва.

В 2020 году участвовала в выборах Президента Республики Беларусь в качестве кандидата.

Живет в городе Минске. Беспартийная. Имеет сына и дочь. Владеет английским и немецким языками. Занимается благотворительностью.



**ЛУКАШЭНКА**
**Аляксандр Рыгоравіч**

**ЛУКАШЕНКО**
**Александр Григорьевич**

Аляксандр Лукашэнка – Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Старшыня Усебеларускага народнага сходу.

Нарадзіўся ў 1954 годзе ў гарадскім пасёлку Копысь Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Беларус.

Мае дзве вышэйшыя адукацыі. У 1975 годзе закончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А.Куляшова, у 1985 годзе – Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Гісторык, эканаміст.

Двойчы праходзіў ваенную службу. У 1975 – 1977 гадах – у пагранічных войсках, у 1980 – 1982 гадах – у Савецкай Арміі на пасадзе намесніка камандзіра роты па палітрабоце вайсковай часці.

Пасля армейскай службы працаваў у камсамольскіх і партыйных органах, займаў пасады намесніка старшыні калгаса «Ударнік» Шклоўскага раёна, намесніка дырэктара камбіната будаўнічых матэрыялаў горада Шклова. У 33 гады Аляксандр Лукашэнка ўзначаліў саўгас «Гарадзец» Шклоўскага раёна.

У 1990 годзе быў выбраны народным дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У 1993 годзе ўзначаліў парламенцкую камісію па барацьбе з карупцыяй.

10 ліпеня 1994 года Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка выбраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, атрымаўшы больш за 80 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў.

У ходзе наступных электаральных кампаній пераабіраўся на пасаду Кіраўніка дзяржавы пераважнай большасцю галасоў выбаршчыкаў.

Аляксандр Лукашэнка – бацька траіх сыноў.

Александр Лукашенко – Президент Республики Беларусь, Председатель Всебелорусского народного собрания.

Родился в 1954 году в городском поселке Копысь Оршанского района Витебской области. Белорус.

Имеет два высших образования. В 1975 году окончил Могилевский государственный педагогический институт им. А.А.Кулешова, в 1985 году – Белорусскую сельскохозяйственную академию. Историк, экономист.

Дважды проходил военную службу. В 1975 – 1977 годах – в пограничных войсках, в 1980 – 1982 годах – в Советской Армии в должности заместителя командира роты по политработе воинской части.

После армейской службы работал в комсомольских и партийных органах, занимал должности заместителя председателя колхоза «Ударник» Шкловского района, заместителя директора комбината строительных материалов города Шклова. В 33 года Александр Лукашенко возглавил совхоз «Городец» Шкловского района.

В 1990 году был избран народным депутатом Верховного Совета БССР. В 1993 году возглавил парламентскую комиссию по борьбе с коррупцией.

10 июля 1994 года Александр Григорьевич Лукашенко избран Президентом Республики Беларусь, получив более 80 процентов голосов избирателей.

В ходе последующих электоральных кампаний переизбирался на пост Главы государства подавляющим большинством голосов избирателей.

Александр Лукашенко – отец троих сыновей.



**СЫРАНКОЎ**
**Сяргей Аляксандравіч**

**СЫРАНКОВ**
**Сергей Александрович**

Нарадзіўся 14 жніўня 1983 года ў гарадскім пасёлку Краснаполле Магілёўскай вобласці.

Закончыў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова па спецыяльнасці «Англійская мова. Нямецкая мова» і Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія».

Прайшоў працоўны шлях ад настаўніка нямецкай мовы ў сельскай школе да першага намесніка начальніка Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама.

Быў дэпутатам Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў дваццаць шостага і дваццаць восьмага скліканняў, Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў дваццаць восьмага склікання, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Галоўны рэдактар установы «Рэдакцыя газеты «Камуніст Беларусі. Мы і час».

Першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Мае сына і дзвюх дачок. Пражывае ў горадзе Мінску.

Родился 14 августа 1983 года в городском поселке Краснополье Могилевской области.

Окончил Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова по специальности «Английский язык. Немецкий язык». Прошел переподготовку в Академии управления при Президенте Республики Беларусь по специальности «Государственное управление и идеология».

Прошел трудовой путь от учителя немецкого языка в сельской школе до первого заместителя начальника главного управления по образованию Могилевского облисполкома.

Был депутатом Краснопольского районного Совета депутатов двадцать шестого и двадцать восьмого созывов, Могилевского областного Совета депутатов двадцать восьмого созыва, депутатом Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь седьмого созыва.

Главный редактор учреждения «Редакция газеты «Коммунист Беларуси. Мы и время».

Первый секретарь Центрального Комитета Коммунистической партии Беларуси.

Имеет сына и двоих дочерей. Проживает в городе Минске.



**ХІЖНЯК**
**Аляксандр Мікалаевіч**

**ХИЖНЯК**
**Александр Николаевич**

Нарадзіўся 16 сакавіка 1978 года ў горадзе Хойнікі Гомельскай вобласці ў сям'і служачых. У 1986 годзе пасля аварыі на ЧАЭС сям'я пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў Мінскую вобласць. З 1996 года пражывае ў горадзе Мінску.

Закончыў Беларускі камерцыйны ўніверсітэт кіравання па спецыяльнасці «Правазнаўства» і Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія», «Антыкрызіснае кіраванне».

З 1999 па 2007 гады працаваў у ААТ «Інстытут «Белгіпрааграхарчпрам» вядучым юрысконсультам, начальнікам інфармацыйна-прававога аддзела, галоўным юрысконсультам.

З 2007 года працуе ў навукова-праектным рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «БЕЛНІІПГРАДАБУДАЎНІЦТВА». З 2015 года дырэктар прадпрыемства.

Дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў дваццаць восьмага і дваццаць дзявятага скліканняў. Старшыня Пастаяннай камісіі Мінгарсавета па горадабудаўніцтве, жыллёвай палітыцы, землекарыстанні і экалогіі.

Старшыня Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці.

Жанаты. Мае траіх сыноў.

Родился 16 марта 1978 года в городе Хойники Гомельской области в семье служащих. В 1986 году после аварии на ЧАЭС семья переехала на постоянное место жительства в Минскую область. С 1996 года проживает в городе Минске.

Окончил Белорусский коммерческий университет управления по специальности «Правоведение» и Академию управления при Президенте Республики Беларусь по специальностям «Государственное управление и идеология», «Антикризисное управление».

С 1999 по 2007 годы работал в ОАО «Институт «Белгипроагропищепром» ведущим юрисконсультом, начальником информационно-правового отдела, главным юрисконсультом.

С 2007 года работает в научно-проектном республиканском унитарном предприятии «БЕЛНИИПГРАДОСТРОИТЕЛЬСТВА». С 2015 года директор предприятия.

Депутат Минского городского Совета депутатов двадцать восьмого и двадцать девятого созывов. Председатель постоянной комиссии Мингорсовета по градостроительству, жилищной политике, землепользованию и экологии.

Председатель Республиканской партии труда и справедливости.

Женат. Имеет троих сыновей.

РУП «Издательство «БДП». Заказ 1503.